**24.** Укажыце, дзе правільна пазначаны марфемы ў слове «*ручаіна*»:

**А)** ручаіна; **Б)** ручаіна; **В)** ручаіна;

**Г)** ручаіна ; **Д)** ручаіна.

**25.** Як называюць мурашак у загадцы «*Семсот ... змуравалі царкву без вуглоў*»?
**А)** маляроў; **Б)** муляроў; **В)** будаўнікоў;
**Г)** мастакоў; **Д)** плотнікаў.

**26.** Як вы думаеце, якога слова не хапае ў паэтычным радку Д. Бічэль-Загнетавай?

*Лёгкія сняжынкі ў цішы*
*Долу апускаюцца ... .*

**А)** хутка; **Б)** імгненна; **В)** баязліва; **Г)** нясмела; **Д)** павольна.

**27.** Адгадайце вершаваную загадку С.М.Шах.

І я таксама просценькая птушка.
Хоць не зязюля, хоць не амялушка,
А ў лесе між сяброўкамі жыву,
Дарослых спевам цешу і дзятву.
Ды неяк давялося мне пачуць,
Што так і човен вёсельны завуць,
Такую ж назву мае і каробка,
З бяросты што плятуць…

**А)** жаваранак; **Б)** берасцянка; **В)** журавель; **Г)** аўсянка; **Д)** бусел.

**28.** Як можна перакласці з рускай на беларускую мову сказ «*Дождь моросит*»? Выберыце правільныя варыянты: 1) *дождж мігціць*; 2) *дождж дрыжыць*; 3) *дождж імжыць*; 4) *дождж струменіць*; 5) *дождж імгліць*.
**А)** 1,4; **Б)** 2,3; **В)** 3,5; **Г)** 4,5;
**Д)** няма правільных варыянтаў.

**29.** Якое першапачатковае значэнне мела слова *рыцар*?
**А)** салдат; **Б)** багатыр; **В)** чалавек; **Г)** абаронца; **Д)** коннік.

**30.** Якая птушка атрымала вобразна-метафарычную назву «*баранчык божы*»?
**А)** чаротаўка; **Б)** сава; **В)** бакас; **Г)** журавель; **Д)** чапля.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА («Буслік»).*
*тэл. (017) 232 80 31, 239 91 72; e-mail: kenguru_belarus@mail.ru*
*http://bak.academy.edu.by*

# Конкурс па беларускай мове
# “БУСЛІК-2004”

Чацвер, 26 лютага 2004 г.

Заданне для вучняў 3-6 класаў.

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, спраўчнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання; складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, правільна адказаўшых на пытанне;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ў удзельніка.

---

*Сымонка і Аленка знайшлі бусліка, які не мог добра лётаць. Птушка паведала дзецям, што зможа высока ўзляцець толькі тады, калі знойдуцца такія знаўцы мовы беларускай, якія адкажуць правільна на ўсе складаныя пытанні. Сымонка і Аленка згадзіліся дапамагчы. Але ў іх узніклі цяжкасці.*

*Дапамажыце, калі ласка, знайсці правільныя адказы.*

**1.** Каго называем беларускім першадрукаром?
**А)** Сымона Буднага; **Б)** Францішка Багушэвіча;
**В)** Міколу Гусоўскага; **Г)** Францыска Скарыну;
**Д)** Янку Купалу.

**2.** Колькі ў беларускай мове галосных літар?
**А)** 6; **Б)** 8; **В)** 12; **Г)** 10; **Д)** 9.

**3.** Дадзены словы: 1) *дзень*; 2) *хадзіў*; 3) *бацька*; 4) *дожджык*; 5) *джала*. Якія словы маюць пяць гукаў?
**А)** 1, 2; **Б)** 3, 5; **В)** 2, 3; **Г)** 4, 5; **Д)** 2, 5.

**4.** Якія літары напішаце пасля ***т*, *д***?
**А)** ё, о, ы; **Б)** ы, і, ь; **В)** ы, о, я; **Г)** і, я, у; **Д)** ы, о, у.

**5.** Які назоўнік не адносіцца да мужчынскага роду?
**А)** заяц; **Б)** певень; **В)** гусь; **Г)** індык; **Д)** конь.

**6.** У якіх словах вы напішаце апостраф? 1) *п...яўка*; 2) *батал...ён*; 3) *ад...езд*; 4) *шампін...ён*; 5) *сям...я*.
**А)** 1, 4, 5; **Б)** 1, 3, 5; **В)** 3, 2, 5; **Г)** 2, 3, 5; **Д)** 1, 3, 4.

**7.** У якім слове колькасць літар у два разы меншая, чым гукаў?
**А)** з'ява; **Б)** суддзя; **В)** ёй; **Г)** дзень; **Д)** яе.

**8.** Колькі ў беларускім алфавіце літар?
**А)** 33; **Б)** 29; **В)** 30; **Г)** 34; **Д)** 32.

**9.** Што адгукаецца, але не паказваецца?
**А)** радыё; **Б)** рэха; **В)** магнітафон;
**Г)** вецер; **Д)** прыёмнік.

**10.** Які назоўнік ужываецца ў беларускай мове толькі ў множным ліку?
**А)** часопісы; **Б)** сталы; **В)** вочы; **Г)** дзверы; **Д)** сцены.

**11.** Дадзены словы: 1) *б...роза*; 2) *б...рвяно*; 3) *с...кера*; 4) *м...даль*; 5) *гл...дач*. У якіх словах трэба ўставіць літару ***е***?
**А)** 1, 2; **Б)** 2, 5; **В)** 2, 4; **Г)** 3, 4; **Д)** 1, 3.

**12.** Запішыце назвы дзён тыдня. Якія з гэтых назваў маюць 6 літар і 6 гукаў?
**А)** 3; **Б)** 1; **В)** 2; **Г)** 5;
**Д)** няма такіх назваў.

**13.** Якое слова з прыведзеных не змяняецца?
**А)** свой; **Б)** шкло; **В)** надта; **Г)** пазнаць; **Д)** прыметны.

**14.** Закончыце прымаўку: *не той сябар, хто мёдам мажа, а той…*
**А)** хто маслам мажа; **Б)** хто анекдоты кажа; **В)** хто праўду кажа;
**Г)** хто варэннем мажа; **Д)** хто лухту кажа.

**15.** Як у народзе кажуць пра туман?
**А)** Туман губляе снег. **Б)** Туман ліквідуе снег. **В)** Туман хавае снег.
**Г)** Туман з'ядае снег. **Д)** Туман выбельвае снег.

**16.** Як правільна перакладаецца з рускай на беларускую мову прыказка «*один с сошкой, а семеро с ложкой*»?
**А)** не перакладаецца; **Б)** сямёра аднаго не чакаюць;
**В)** якое карэнне,такое і насенне; **Г)** адзін горбіцца, а сто корміцца;
**Д)** на языку мядок, а на сэрцы лядок.

**17.** Якія словы не толькі называюць гародніну, але і хаваюць у сабе назвы нот? 1) *гарох*; 2) *памідор*; 3) *агурок*; 4) *капуста*; 5) *фасоля.*
**А)** 1, 2; **Б)** 3, 5; **В)** 2, 5; **Г)** 2, 4; **Д)** 3, 4.

**18.** Колькі імён можна знайсці ў слове *цаліна*, не перастаўляючы ніводнай літары?
**А)** 2; **Б)** 4; **В)** 3; **Г)** 0; **Д)** 1.

**19.** Які запіс перадае правільнае гучанне слова *дзядзька*?
**А)** [д'яд'ка]; **Б)** [дз'ат'ка]; **В)** [д'ад'ка]; **Г)** [дз'ац'ка]; **Д)** [дз'адз'ка].

**20.** Знайдзіце месца дзеясловам: 1) *свішча*; 2) *вые*; 3) *звіслі* – у паэтычных радках Я. Коласа:

Нізка … над зямлёю
Хмары снегавыя,
… вецер за сцяною,
У коміне … .

**А)** 2, 3, 1; **Б)** 2, 1, 3; **В)** 3, 1, 2; **Г)** 3, 2, 1; **Д)** 1, 2, 3.

**21.** Расшыфруйце рэбусы і вызначце толькі птушак.




1) 2) 3) 4) 5)

**А)** 1,2,3; **Б)** 2,4; **В)** 2, 5; **Г)** 3,5; **Д)** 3, 4, 5.

**22.** Колькі памылак дапусцілі героі верша Эдзі Агняцвет «Грамацеі»?

*Саня – першы грамацей,*
*А за ім ідзе Мацей.*
*Саня піша:*
*«Роўна ў восім*
*На футбол з'евіцьца просім».*
*– Непісьменная аб'ява,*
*Класу нашаму – няслава!*
*Раззлаваўся грамацей.*
*Перапісвае Мацей:*
*«У нідзелю роўна ў восям*
*На футбол з'явіца просям».*
*– І куды вы ўсе глядзелі?*
*Не ў «нідзелю»,*
*А ў «недзелю», –*
*Хомка – трэці грамацей –*
*Напісаў яшчэ прасцей.*
*Цэлы стос паперы чыстай*
*Сапсавалі футбалісты...*

**А)** 6; **Б)** 7; **В)** 9; **Г)** 8; **Д)** 10.

**23.** Дадзены словы: 1) *абру́ч*; 2) *дачка́*; 3) *адзі́наццаць*; 4) *крапіва́*; 5) *ста́ры*; 6) *белізна́*; 7) *нема́ўля*; 8) *ру́чнік*; 9) *акра́ец*; 10) *крыні́ца*. У якіх словах правільна пастаўлены націск?
**А)** 1,3,5,7,9; **Б)** 4,6,7,8,10; **В)** 1,2,5,7,8;
**Г)** 1,2,4,6,9; **Д)** 2,3,5,6,10.